# Гомельскі напрамак

**Важнай падзеяй канца восені 1943 года на франтах Вялікай Айчыннай вайны стала наступальная аперацыя Чырвонай арміі па вызваленні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў першага буйнога горада і абласнога цэнтра Беларусі – Гомеля. Яе паспяховы ход і завяршэнне былі забяспечаны дзякуючы неймаверным гераізму і адвазе салдат і афіцэраў Беларускага фронту і стратэгічнаму мысленню выдатнага савецкага палкаводца будучага маршала Канстанціна Ракасоўскага. Гомельскі напрамак стаў вызначальным і ў іншых бітвах па ачышчэнні беларускай зямлі ад ворага. Каб даведацца, як гэта адбывалася 75 гадоў таму, аглядальнік «Беларускай думкі» накіраваўся ў адзін з музеяў горада на Сожы.**

## Як паў «паўднёвы бастыён»

– Існуе легенда, што пасля разгрому гітлераўцаў на Курскай дузе галоўны стратэг гэтай бітвы генерал К. Ракасоўскі накіраваў пераможны марш «паўднёвых» войск свайго Цэнтральнага фронту – 13-й і 60-й армій – у кіеўскім напрамку, – расказвае загадчык аддзела навукова-асветнай работы Гомельскага абласнога музея баявой славы Ала Ягорава. – Аднак нечакана для баявога генерала рашэннем Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання гэтыя вайсковыя падраздзяленні ў яго «адабралі» і перадалі Варонежскаму фронту на чале з генералам М. Ватуціным. Адпаведна быў скарэкціраваны і галоўны напрамак наступлення войск Цэнтральнага фронту – з кіеўскага на гомельскі. Ракасоўскі абурыўся і патэлефанаваў Сталіну, але падтрымкі ў яго не знайшоў, а на свае нараканні атрымаў адказ, што вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Гомеля не менш важная задача, чым авалоданне сталіцай Украіны, і, маўляў, з гэтым ніхто лепш за яго не справіцца…

Так гэта было ці інакш, але, атрымаўшы новы загад, К. Ракасоўскі ўзяўся за распрацоўку стратэгіі вызвалення Гомеля. І гэта была далёка не простая задача. На гомельскім напрамку савецкім войскам супрацьстаялі падраздзяленні нямецкай групы армій «Цэнтр» агульнай колькасцю звыш 250 тыс. чалавек. У самім Гомелі і ў бліжэйшым яго наваколлі дыслацыраваліся 2-я і 4-я арміі і значная частка 9-й арміі праціўніка. Да таго ж, атрымаўшы разведданыя аб руху галоўных сіл Цэнтральнага фронту на горад на Сожы, камандаванне вермахта дадаткова перакінула туды яшчэ сем пяхотных дывізій і брыгаду СС.

«В полосе действий войск фронта, в границах Белоруссии на основном и очень для нас важном направлении находился крупный областной промышленный центр Гомель, – адзначыў у сваіх пасляваенных мемуарах «Солдатский долг» маршал К. Ракасоўскі. – Быстрое овладение этим городом являлось важной задачей по оперативным и политическим соображениям. Это учитывал и противник, который принял все меры к удержанию за собою города и окрестностей. Гомель был расположен в полосе основной обороны немцев. Они превратили его в мощный опорный пункт. Наши попытки овладеть Гомелем с ходу не увенчались успехом. И нам пришлось приступить к организации планомерных действий».

– Ваенным саветам фронту быў распрацаваны першапачатковы план баявой аперацыі па вызваленні Гомеля, – расказвае далей Ала Барысаўна. – Ім прадугледжвалася стварэнне на паўднёвым і паўночным флангах фронту моцных воінскіх груповак, у задачу якіх уваходзіў прарыў варожай абароны з наступным ахопам горада з захаду і паўночнага ўсходу. Пры спрыяльных умовах абедзве гэтыя групоўкі павінны былі сустрэцца на паўночнай ускраіне Гомеля і замкнуць кола акружэння ворага. Гэта

смелая задума была ўхвалена Стаўкай Вярхоўнага Галоўнакамандавання. У далейшым план К. Ракасоўскага некалькі разоў карэкціраваўся, удакладняўся і дапаўняўся, пасля чаго ўвайшоў у гісторыю Другой сусветнай вайны як Гомельска-Рэчыцкая наступальная аперацыя, канчатковай задачай якой якраз і было авалоданне горадам на Сожы.

Па сутнасці, вызваленне Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пачалося 10 лістапада з наступлення трох агульнавайсковых армій – 65, 48 і 61-й – ужо Беларускага (да 20 кастрычніка называўся Цэнтральны) фронту на Рэчыцу. Праз тыдзень упартых баёў гэты горад быў ачышчаны ад акупантаў, пасля асноўныя сілы савецкіх войск у складзе 65-й і 61-й армій павярнулі на захад, у напрамку Калінкавічаў і Мазыра, а 48-я армія, працягваючы рух на поўнач, дайшла да сутокаў рэк Бярэзіна і Днепр і, паспяхова фарсіраваўшы водную перашкоду, замацавалася на плацдарме на поўдзень ад Жлобіна. Адначасова падраздзяленні 11-й і 63-й армій, якія дзейнічалі ў цэнтры фронту, вызвалілі ад немцаў шэраг населеных пунктаў на паўночны ўсход ад Гомеля, у тым ліку вёскі Старое Сяло, Хальч, Навасёлкі, Шарсцін, Лапаціна, Касцюкоўка. Яны перарэзалі чыгунку, а пасля і шашэйныя дарогі, што вялі з абласнога цэнтра ў паўночным кірунку, і шчыльна ахапілі нямецкую групоўку з усходу і паўночнага ўсходу. Пасля чаго «гомельскі вузел» пачаў сціскацца і над ворагам навісла пагроза трапіць у «кацёл»...

Як вынікае з аператыўных данясенняў штаба Беларускага фронту, часці 102-й стралковай дывізіі ў ноч з 24 на 25 лістапада, вызваліўшы станцыю Мільча, уварваліся на заходнюю ўскраіну Гомеля. У той жа прамежак часу падраздзяленні 11-й і 63-й армій авалодалі паўночна-ўсходняй ускраінай горада. І толькі пасля гэтага, рэальна ўзважыўшы сітуацыю, нямецкае камандаванне пачало адводзіць свае войскі. «Судьба города Гомеля решилась на флангах. Решительные действия наших войск на южном и северном флангах буквально выдавили немцев из города», – напіша пазней у кнізе ўспамінаў маршал К. Ракасоўскі.

Пры адступленні немцы аказвалі моцнае супраціўленне. Як сведчаць архіўныя матэрыялы, пад вечар 25 лістапада першымі з паўночнага ўсходу непасрэдна ўжо ў горад уварваліся 96-я стралковая і 217-я Унецкая стралковая дывізіі 11-й арміі. Услед за імі ў ноч на 26 лістапада перайшлі ў вырашальнае наступленне з паўднёвага ўсходу, з раёна Навабеліцы, падраздзяленні 4-й Бежыцкай стралковай дывізіі, 115-га ўмацаванага раёна ўсё той жа 11-й арміі і 102-й Далёкаўсходняй Ноўгарад-Северскай стралковай дывізіі 48-й арміі, якія, фарсіраваўшы раку Сож, квартал за кварталам сталі вызваляць Гомель.

Вулічныя баі вяліся ўсю ноч і раніцу, і да 9 гадзін 30 хвілін «паўднёвы бастыён Беларусі», як часам называлі горад на Сожы самі немцы, быў поўнасцю ачышчаны ад ворага. А ўжо вечарам 26 лістапада, роўна ў 21 гадзіну, у Маскве 20 артылерыйскімі залпамі з 224 гармат у гонар вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў першага беларускага абласнога цэнтра прагрымеў урачысты салют. У гэты ж дзень вайсковым падраздзяленням, якія прымалі ўдзел у баявых дзеяннях за авалоданне горадам, Вярхоўны галоўнакамандуючы І. Сталін аб'явіў падзяку, а больш як два дзясяткі палкоў, дывізій і карпусоў былі ўдастоены ганаровага найменя «Гомельскіх».

Гістарычны летапіс вызвалення Гомеля захаваў шмат імёнаў пераможцаў, тых, хто асабліва вызначыўся ў баях, хто, не шкадуючы ўласнага жыцця, змагаўся з ворагам. Сярод іх – 17 салдат і афіцэраў, якім было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У выгнанні з горада на Сожы нямецка-фашысцкіх захопнікаў прымалі ўдзел такія вядомыя пазней асобы, як нобелеўскі лаўрэат па літаратуры Аляксандр Салжаніцын, вядомы савецкі кардыяхірург Мікалай Амосаў, паэты Юлія Друніна і Яўген Далматоўскі. Памятаюць гамяльчане і прозвішчы яфрэйтара 1-й роты 39-га стралковага палка 4-й Бежыцкай стралковай дывізіі 11-й

арміі Міхаіла Васільева і літсупрацоўніка газеты «Знамя Советов» 11-й арміі лейтэнанта Рыгора Кірылюка, якія ўстанавілі чырвоныя сцягі на вышынных гарадскіх аб'ектах. Адзін зрабіў гэта на паўразбураным будынку электрастанцыі, другі – на пажарнай каланчы.

Вызваліўшы Гомель, савецкія войскі завяршылі першую буйнамаштабную наступальную аперацыю на тэрыторыі Беларусі, якая азнаменавалася шэрагам тактычных ваенных дасягненняў. Многія з іх лаканічна адзначыў у сваіх успамінах яе галоўны стратэг К. Ракасоўскі: «Важным результатом Гомельско-Речицкой операции Белорусского фронта явилось то, что она содействовала успеху соседа – 1-го Украинского фронта, проводившего в этот период большое наступление на киевском направлении. Скованный войсками нашего фронта, противник не смог перебросить в район Киева из Белоруссии ни одной дивизии.

В ходе всей операции мы поддерживали тесную связь с белорусскими партизанами, которые самоотверженно выполняли наши задания. Они взрывали мосты в тылу вражеских войск, разрушали железнодорожные пути, уничтожали склады горючего и боеприпасов, указывали цели для ударов нашей авиации, снабжали нас ценнейшими сведениями о противнике».

Аднак пасля вызвалення Гомеля развіваць свой пераможны поспех савецкія войскі не сталі. Тлумачэнне гэтаму зноў жа знаходзім у кнізе мемуараў К. Ракасоўскага: «Выполнив основную задачу – осуществив прорыв главного оборонительного рубежа противника, войска фронта повели бои за выгодные рубежи, с которых предстояло начать решительное сражение за освобождение всей Белоруссии. Однако подходил момент, когда нужно было уже думать о перерыве в наступательных действиях: войска выдыхались. Впереди же предстояли тяжелые бои, и к ним следовало солидно подготовить коммуникации, сократить до минимума время на подвоз боеприпасов, навести разрушенные переправы через крупные реки. Враг, отступая, делал все, чтобы затруднить продвижение наших войск. Гитлеровцы пускали специальные поезда, которые ломали пополам каждую шпалу. Рельсы, насыпи, мосты разрушали взрывчаткой. А вокруг – сплошные болота. Чтобы продвигать технику, требовалось прокладывать гати, вырубать просеки, наводить мосты через многочисленные речки, заболоченные поймы…»



▲ Стратэгі Гомельска-Рэчыцкай наступальнай аперацыі: камандуючы Беларускім фронтам К. Ракасоўскі (у цэнтры), член Ваеннага савета фронту К. Цялегін (злева) і начальнік штаба фронту М. Малінін

## Другая сталіца

Вызвалены Гомель уяўляў сабой цяжкі для чалавечага ўспрымання малюнак – горад амаль цалкам быў разбураны. Ужо на наступны дзень, 27 лістапада 1943 года, газета «Красная звезда» пісала: «Трудно ответить на вопрос: сохранился ли Гомель? Взорванные дома, пепелища, над которыми поднимается серый дымок, разбитые ограды, сломанные заборы, выбитые окна в уцелевших домах, на улицах валяются обломки мебели… Такой вид имеет место грабежа после бегства грабителей».

– Захаваліся дакументы, – расказвае далей А. Ягорава, – у якіх апісаны стан прамысловых прадпрыемстваў у вызваленым ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Гомелі: «Гомсельмаш» – засталося некалькі напаўразбураных каробак вытворчых будынкаў… Станкабудаўнічы завод імя Кірава – не ўцалела ніводнага цэха… Вагонарамонтны завод – адны руіны… Суднарамонтны – кучы друзу і

пакарабачанага металу...». Больш як на 80 працэнтаў быў разбураны жылы фонд горада, а колькасць яго насельніцтва не перавышала 15 тыс. жыхароў. Для параўнання: да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў Гомелі пражывала больш за 140 тыс. чалавек.

У гэтай змрочнай сітуацыі не-не ды здараліся светлыя моманты. Адзін з іх мае надзвычай цікавую гісторыю. Як ужо адзначалася, сярод вызваліцеляў Гомеля быў і франтавы карэспандэнт, ужо тады вядомы савецкі паэт Яўген Далматоўскі. Аглядаючы горад, у якім толькі-толькі адгрымелі жорсткія баі, ён заўважыў адзін з дарожных знакаў, што вызначаў напрамак на Мінск. Да гэтага яму з такой жа «вызваленчай місіяй» даводзілася знаходзіцца ў Арле і Бранску, дзе таксама перад яго вачамі паўставалі знакі з назвамі іншых гарадоў. І гэтае назіранне падказала сюжэт яго чарговага верша. «Когда после Курской битвы мы шли на запад, освобождали город за городом, мои товарищи и я обратили внимание на простой факт: покидая город, мы непременно шагали по улице, носящей имя следующего города, который предстояло скоро штурмовать, – успамінаў пазней паэт. – ...В Гомеле я написал стихотворение «Улицы-дороги», где говорилось о Брянской улице в Орле, Гомельской – в Брянске, Минской – в Гомеле. Стихотворение обрывалось на призыве «Значит, в Минск дорога... Вперёд на Минск!». Верш быў надрукаваны ў франтавой газеце «Красная Армия» і адразу ж атрымаў шырокую папулярнасць сярод савецкіх салдат. Яны ўзялі яго сабе «на ўзбраенне» і заспявалі ў дывізіях і палках, прычым на розныя матывы, якія самі падбіралі вайсковыя запявалы.

▼Магчыма, акурат гэты дарожны знак, устаноўлены на адной з вуліц Гомеля, падказаў паэту Я. Далматоўскаму сюжэт для яго верша, які затым стаў папулярнай песняй. Фота канца 1943 года




Акрылены такім поспехам свайго твора, Я. Далматоўскі адправіў яго ў Маскву кампазітару Марку Фрадкіну, аднак адказу не атрымаў і з часам забыўся пра сваю просьбу. І толькі недзе праз год, ужо ў канцы вайны, паэт пачуў па радыё голас Леаніда Уцёсава, які выконваў песню быццам бы са словамі яго верша, але ў крыху змененым варыянце: у твора з'явіўся працяг, які заклікаў імкліва рухацца салдат-вызваліцеляў ужо не на Мінск, а на Берлін. Аказалася, М. Фрадкін усё ж напісаў музыку, а тэкст падправіў сам Л. Уцёсаў. «Песню «Улицы-дороги» я пел с большим удовольствием, – згадваў Леанід Восіпавіч, – она всегда имела успех. Одна беда, песня скоро стала стареть. Ведь кончалась она призывом «Вперёд, на Минск!». А в июле 1944 года столица Белоруссии была освобождена. Советские воины шли дальше на запад. И я стал прибавлять названия новых городов, взятых нашими войсками, – Брест, Львов, Люблин, Варшава и так далее, а заканчивал словами «На Берлин!». Песня снова стала злободневной». З папраўкамі знакамітага спевака яна атрымала другое жыццё і стала называцца «Дорога на Берлин».

Праз месяц пасля вызвалення – 26 снежня 1943 года – у Гомелі адбыўся агульнагарадскі мітынг. На ім быў прыняты прывітальны зварот працоўных горада да камандуючага Беларускім фронтам генерала арміі К. Ракасоўскага, у якім выказвалася глыбокая ўдзячнасць байцам і камандзірам, што прымалі ўдзел у вызваленні горада ад гітлераўскіх акупантаў. Былі ў ім і такія словы гамяльчан: «Мы просим Вас, товарищ Рокоссовский, передать руководимым Вами войскам наше заверение в том, что мы приложим все наши силы и умение для скорейшего восстановления нашего города, наших фабрик и заводов, наших колхозов, совхозов и МТС». І жыхары Гомеля актыўна ўключыліся ў працэс аднаўлення гарадской інфраструктуры, прамысловых прадпрыемстваў і сацыяльных аб'ектаў. Пры гэтым істотная дапамога, найперш у выглядзе будаўнічых матэрыялаў, абсталявання і прадуктаў харчавання, паступала ад працоўных Урала, Мардовіі і іншых расійскіх рэгіёнаў, а таксама закаўказскіх савецкіх рэспублік.

Значнай падзеяй у гісторыі Гомеля быў азнаменаваны і апошні дзень 1943 года – 31 снежня ў горад з Масквы былі пераведзены ўрад Беларусі і ЦК КП(б)Б. Яны размясціліся ў Навабеліцы – гомельскім мікрараёне, які найменш пацярпеў ад баявых дзеянняў. І з таго часу горад на Сожы больш як на паўгода – да 15 ліпе-

ня 1944 года – з'яўляўся сталіцай Беларускай ССР. У той жа дзень увечары ў клубе фанерна-запалкавай фабрыкі «Везувій» прайшло сумеснае пасяджэнне Цэнтральнага камітэта Кампартыі, Вярхоўнага Савета і Савета народных камісараў БССР, прысвечанае 25-годдзю ўтварэння рэспублікі. З дакладам на ім выступіў першы сакратар ЦК КП(б)Б Панцеляймон Панамарэнка. Урачыстая нарада закончылася незадоўга да наступлення 1944 года, а як толькі па радыё прагучаў навагодні бой крамлёўскіх курантаў, пачаўся святочны канцэрт, у якім прынялі ўдзел вядомыя беларускія спевакі, музыканты і артысты, у іх ліку – будучыя народныя артысты Савецкага Саюза і Беларусі Ларыса Александроўская, Ганна Абуховіч, Ларыса Аляксеева.

Следам за ЦК КП(б)Б і беларускім урадам у Гомелі «раскватараваліся» і некаторыя дзяржаўныя ўстановы. Аднымі з першых сюды пераехалі Мінская друкарская фабрыка Дзяржзнака і архіў бібліятэкі імя Горкага (сучасная Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь). Там жа знаходзіліся рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия» і газеты-агітплаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». Дарэчы, апошняе выданне пачало выходзіць у 1941 годзе менавіта ў Гомелі, затым друкавалася ў прыфрантавой паласе і Маскве, адкуль і вярнулася ў Беларусь. У 1945 годзе яго рэдакцыя пераехала ў Мінск, і газета была пераўтворана ў сатырычна-гумарыстычны ілюстраваны часопіс «Вожык», нацэлены на мірныя, але таксама надзённыя тэмы. У Залінейным раёне Гомеля, ва ўцалелым прыватным доме па вуліцы Адэскай (цяпер – імя К. Ракасоўскага), да сярэдзіны красавіка 1944 года размяшчаўся штаб Беларускага (з лютага 1944 года – 1-га Беларускага) фронту...

## Ад Прапойска да Рудабельскіх «варот»

Неўзабаве доўгачаканае вызваленне прыйшло і ў некаторыя іншыя беларускія гарады і вёскі. Таксама 26 лістапада быў поўнасцю ачышчаны ад захопнікаў Кармянскі раён. Яго адміністрацыйны цэнтр у варожым абарончым плацдарме адыгрываў надзвычай важную ролю. Гітлераўцы ператварылі Карму ў цяжкапераадольны рубеж. Тым не менш часцям 121-й гвардзейскай і 283-й стралковых дывізій ва ўзаемадзеянні з 117-й танкавай брыгадай, якія ўваходзілі ў склад 3-й арміі Беларускага фронту, удалося яго пераадолець – бой за гарадскі пасёлак Карма працягваўся больш за суткі, у выніку чаго гітлераўцы вымушаны былі адступіць. Савецкія ж войскі, развіваючы свой наступальны напор, назаўтра прымусілі ворага капітуляваць і ў суседніх з Кармой гарадах – Чачэрску, Буда-Кашалёве і гарадскім пасёлку Уваравічы (на той час – цэнтр аднайменнага адміністрацыйнага раёна).



▲ Разбурэнні ў цэнтральнай частцы Гомеля. Канец лістапада 1943 года

А днём раней, 25 лістапада, падраздзяленнямі 3-й арміі Беларускага фронту быў ачышчаны ад немцаў горад Прапойск. Для савецкіх войск гэты населены пункт меў важнае стратэгічнае значэнне, бо яго вызваленне, з'яўляючыся неад'емнай часткай Гомельска-Рэчыцкай аперацыі, давала магчымасць зайсці ў тыл праціўніка. У азнаменаванне паспяхова праведзенай аперацыі дывізіі, што найбольш вызначылася пры вызваленні гэтага горада, у маі 1945 года было прысвоена найменне... «Слаўгарадская». Але чаму? Адказ на гэта пытанне дае цікавы гістарычны факт...

Пры падрыхтоўцы ўзнагародных дакументаў у афіцэраў Стаўкі ўзнікла праблема: вельмі ж немілагучна гуча-

ла ў праекце загада Вярхоўнага галоўнакамандуючага І. Сталіна словазлучэнне «Прапойская гвардзейская дывізія». Зразумела, ніхто не стаў унікаць у этымалогію назвы паселішча – ад слова «прупой», што азначае моцны водаварот, які ўтвараецца ў месцы зліцця рэк (тут пры ўпадзенні ракі Проня ў Сож, дзе і размешчаны горад), а было прынята катэгарычнае рашэнне аб перайменаванні Прапойска ў Слаўгарад, што затым і пацвердзіў сваім указам ад 25 мая 1945 года Вярхоўны Савет СССР.

У апошнія дні восені 1943 года падраздзяленні Чырвонай арміі сумесна з партызанскімі атрадамі вялі баі і за вызваленне асобных тэрыторый на поўдні сучаснай Гомельскай вобласці. Так, на працягу трох дзён – 27–29 лістапада – была праведзена Ельская аперацыя. Яе мэтай было авалоданне раённым цэнтрам Палескай вобласці – гарадскім пасёлкам Ельск. Камандаванне 37-й Ельскай партызанскай брыгады наладзіла сувязь з 12-м гвардзейскім стралковым палком 1-га Украінскага фронту, пасля чаго быў распрацаваны план сумесных дзеянняў.

Гарнізон Ельска налічваў каля 600 гітлераўцаў. У ноч на 27 лістапада савецкія воіны і партызаны ўварваліся ў пасёлак і пасля некалькіх гадзін бою вызвалілі яго. Аднак праціўніку ўдалося замацавацца на чыгуначнай станцыі, адкуль ён наладзіў некалькі контратак. У выніку найбольш магутнай з іх, пры падтрымцы 54 танкаў, 29 лістапада фашысты зноў занялі Ельск. Пасля гэтага на працягу снежня 1943 года партызаны 37-й Ельскай брыгады разам з падраздзяленнямі Чырвонай арміі правялі яшчэ некалькі баёў за гэты населены пункт, але не мелі станоўчага выніку. Канчаткова Ельск быў вызвалены толькі 11 студзеня 1944 года.

Куды больш паспяхова разгортваліся дзеянні па вызваленні ўсходняга суседа Ельска – горада Нароўлі. У ноч на 30 лістапада атрады 27-й Нараўлянскай імя С. Кірава партызанскай брыгады сумесна з падраздзяленнямі 415-й стралковай дывізіі 61-й арміі Беларускага фронту выбілі адтуль ворага. Пра вызваленне горада ў аператыўнай зводцы Саўінфармбюро за 1 снежня адзначалася: «В районе нижнего течения реки Припять наши войска с боями продвигались вперед. Части Н-ского соединения, в результате ожесточенных боев за переправы, форсировали Припять и овладели районным центром Полесской области Наровля. Преследуя разбитые части противника, наши бойцы заняли еще несколько населенных пунктов. Захвачены трофеи и значительное число пленных». Як бачна, у гэтым паведамленні не згадваецца роля народных мсціўцаў у вызваленні горада. Паколькі навіну пра авалоданне Нароўляй перадавалі ў Стаўку Вярхоўнага Галоўнакамандавання па каналах аператыўнай сувязі са штаба Беларускага фронту, магчыма, пра ўдзел партызан у гэтай аперацыі проста забыліся, а можа, замоўчвалі спецыяльна. Аднак пазней заслуга 27-й Нараўлянскай імя С. Кірава партызанскай брыгады ў вызваленні горада на Прыпяці была шырока абнародавана і трывала замацавана ў аналах гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Ёсць і яшчэ адзін прыклад удалага баявога супрацоўніцтва народных мсціўцаў Гомельшчыны з падраздзяленнямі Чырвонай арміі. Так, у канцы лістапада 1943 года партызаны 123-й Акцябрскай імя 25-годдзя БССР брыгады пры падтрымцы 37-й і 60-й стралковых дывізій 65-й арміі Беларускага фронту паміж вёскай Азарычы і гарадскім пасёлкам Парычы ўтварылі 10-кіламетровы прарыў, які атрымаў назву Рудабельскія «вароты». Праз гэты пралом у тыл ворага накіроўваліся разведгрупы і сувязныя, дастаўляліся зброя, боепрыпасы, медыкаменты. З акупіраванай тэрыторыі партызаны перадавалі камандаванню Чырвонай арміі разведданыя, забяспечвалі вайсковыя часці праваднікамі, пераpraўлялі ў савецкі тыл параненых і хворых, вывезлі некалькі дзясяткаў тысяч мірных жыхароў. Адсюль нямала добраахвотнікаў папоўнілі шэрагі 65-й арміі. Рудабельскія «вароты» існавалі з 28 лістапада па 21 снежня 1943 года. Калі гітлераўцам усё ж удалося іх «закрыць», то разрозненыя часткі падраздзяленняў Чырвонай арміі апынуліся ў тыле ворага. Але іх камандзіры і салдаты не разгубіліся

▼ Яфрэйтар М. Васільеў замацоўвае чырвоны сцяг на будынку электрастанцыі. Фота 1943 года



і арганізавалі зводны полк і на працягу двух месяцаў разам з партызанамі вялі актыўныя баявыя дзеянні на акупіраванай фашыстамі тэрыторыі, пакуль 16 лютага 1944 года не прарваліся праз лінію фронту. Дарэчы, у гонар Рудабельскіх «варот» каля вёскі Мікуль-Гарадок Акцябрскага раёна ўстаноўлены помнік.

## Пад Гарадком

Важнай падзеяй у летапісе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў стала і Гарадоцкая наступальная аперацыя, якая праводзілася на поўначы нашай краіны сіламі 1-га Прыбалтыйскага фронту з 13 па 31 снежня 1943 года. Яе першачарговай задачай было вызваленне горада Гарадок Віцебскай вобласці з максімальным набліжэннем да пазіцый ворага, што прыкрывалі з усходу і поўначы абласны цэнтр.

З успамінаў камандуючага 1-м Прыбалтыйскім фронтам генерала Івана Баграмяна: «Решающий бой за Городок начался 23 декабря 1943 года. Перед атакой была проведена разведка боем. Она выявила наиболее опасные очаги немецкого сопротивления. В 11.00 часов 23 декабря началась артиллерийская подготовка. После часовой артподготовки перешли в наступление соединения 11-й гвардейской и 43-й армии. Разгорелись жестокие рукопашные схватки в траншеях и ходах соединений. Бой продолжался 36 часов, велся не только днем, но и ночью… Удар гвардейцев был яростным и неудержимым. Преодолев русло реки по льду, они ворвались на северную окраину города. Первым это удалось сделать батальону старшего лейтенанта С. Тернавского. Хорошо проявили себя в ночном бою и бойцы действовавшего рядом батальона старшего лейтенанта Ф. Меркулова. Он и его замполит капитан Руднев неотлучно находились в рядах атакующих, вдохновляли их личным примером.

Ворвавшись в город, оба эти подразделения сражались напористо и дерзко: прорываясь на фланги и в тыл опорных пунктов, вели по ним непрерывный минометный и пулеметный огонь. Неся



▲ Помнік савецкім воінам – вызваліцелям Гомеля

большие потери и опасаясь изоляции и окружения, фашистские гарнизоны начали спасаться бегством. Видя это и не имея свободных резервов, неприятельское командование сняло часть сил с восточного фаса городского обвода. Это тотчас же использовал генерал-майор А.И. Максимов, командир 11-й гвардейской дивизии. Он посадил автоматчиков на несколько приданных ему танков и бросил их на юго-восточную окраину города. В короткой, но ожесточенной схватке танкисты и автоматчики десанта выбили гитлеровцев, засевших в каменных домах, превращенных в доты».

Поўнасцю Гарадок быў ачышчаны ад ворага 24 снежня 1943 года. У той жа дзень вечарам у гонар яго вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Маскве быў дадзены салют 12 артылерыйскімі залпамі з 124 гармат. 12 падраздзяленням, якія найбольш вызначыліся ў баях, было прысвоена найменне «Гарадоцкіх».

У ходзе Гарадоцкай наступальнай аперацыі, якая стварыла для савецкіх войск спрыяльныя ўмовы для наступлення ў віцебскім напрамку, было вызвалена 1220 населеных пунктаў, знішчана больш за 65 тыс. і ўзята ў палон 3,3 тыс. гітлераўцаў. Яна стала апошняй у 1943 годзе буйной ваеннай аперацыяй, праведзенай савецкімі войскамі на тэрыторыі Беларусі.

Сяргей ЖОЛУД